**УСТАНОВА “БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АРХІЎ-МУЗЕЙ ЛІТАРАТУРЫ І МАСТАЦТВА”**

# ПАНІЗНІК СЯРГЕЙ СЦЯПАНАВІЧ

**ПАЭТ, ПЕРАКЛАДЧЫК, ГРАМАДСКІ ДЗЕЯЧ**

**НАР. 10 ТРАЎНЯ 1942 Г.**

**ФОНД № 32**

**ВОПІС № 1**

**[да 1920]–2015,**
**коп. за 1885-1991 гг.**

**МІНСК 2026**

# ЗМЕСТ

**да воп. № 1 ф. 32**


| №№ | Назва раздзелаў | № спраў | № стар. воп. |
|---|---|---|---|
| | ПРАДМОВА | | |
| 1. | ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА | 1-4 | 1 |
| 2. | ПЕРАПІСКА С.С. ПАНІЗНІКА | 5-35 | 2-7 |
| 2.1. | ПІСЬМЫ АД С.С. ПАНІЗНІКА | 5-8 | 2 |
| 2.2. | ПІСЬМЫ ДА С.С. ПАНІЗНІКА | 9-31 | 4-6 |
| 2.3. | ПІСЬМЫ С.С. ПАНІЗНІКУ АД УСТАНОЎ | 32-35 | 6-7 |
| 3. | ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ С.С. ПАНІЗНІКУ | 36-41 | 7-8 |
| 4. | ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.С. ПАНІЗНІКА | 42-56 | 8-11 |
| 4.1. | АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА | 42-45 | 8-9 |
| 4.2. | ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ С.С. ПАНІЗНІКА | 46-50 | 9-10 |
| 4.3. | ДАКУМЕНТЫ ДАСЛЕДЧАЙ, НАВУКОВАЙ І ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ С.С. ПАНІЗНІКА І ІНШ. | 51-56 | 10-11 |
| 5. | ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЙНЫХ ДАТ С.С. ПАНІЗНІКА І ІНШ. | 57-58 | 11-12 |
| 6. | ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ С.С. ПАНІЗНІКА | 59-60 | 12 |
| 7. | ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ С.С. ПАНІЗНІКАМ | 61-75 | 12-16 |
| 8. | ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА, ДАКУМЕНТЫ Я.І. ЯНІШЧЫЦ (1-Й ЖОНКІ) | 76-81 | 16-17 |
| 9. | СПІС КНІГ | | |

## Прадмова

**Панізнік Сяргей Сцяпанавіч** (псеўданімы **С. Папар**, **Сяргей Папар**) нарадзіўся 10 траўня 1942 года ў сялянскай сям’і ў вёсцы Бабышкі Мёрскага раёна Віцебскай вобласці. У 1949–1959 гадах навучаўся ў Латаўшчынскай пачатковай школе, пасля – у Лявонпальскай сярэдняй школе. У 1962 годзе скончыў фельчарскае аддзяленне Магілёўскага медыцынскага вучылішча (цяпер – Магілеўскі дзяржаўны медыцынскі каледж), працаваў фельчарам Княжыцкай участковай бальніцы пад Магілёвам. У 1962–1963 гадах служыў фельчарам дывізіёна ў вайсковай частцы Беларускай ваеннай акругі. У 1963–1967 гадах вучыўся на факультэце журналістыкі Львоўскага ваенна-палітычнага ордэна Чырвонай Зоркі вучылішча (пасля рэарганізацыі – Нацыянальная акадэмія сухапутных войскаў імя гетмана Пятра Сагайдачнага). У 1967–1976 гадах працаваў ваенным журналістам (у 1967–1973 гадах – у складзе Цэнтральнай групы войск служыў у Чэхаславакіі, потым – у БССР). У 1976 годзе быў звольнены з арміі па абвінавачанні ў антысаветызме, выключаны з КПСС, нейкі час не працаваў. У 1977–1982 гадах працаваў стыльрэдактарам Дзяржтэлерадыё БССР [адначасна журналістам у газеце “Вячэрні Мінск”], у 1982–1996 гадах – рэдактарам (загадчыкам, пазней – вядучым рэдактарам рэдакцыі літаратуры для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту) выдавецтва “Юнацтва”, у 1992–1994 гадах – у Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францыска Скарыны, у 1996–1999 гадах – вучоным сакратаром Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы[1].

Першы верш С.С. Панізніка “Фестывальнае свята” быў надрукаваны ў 1959 годзе ў Мёрскай раённай газеце “Зара камунізму”. Аўтар зборнікаў паэзіі “Кастры Купалля” (1967), “Палявая пошта” (1972), “Крона надзеі” (1975), “Чало і век” (1979), “Слова на дабрыдзень” (1982), “Мацярык” (1984), “Стырно” (1989), “А пісар земскі…” (1994), “Сустрэча роднасных сусветаў” (1997) і зборнікаў вершаў для дзяцей “Адкуль вясёлка п’е ваду” (1981), “Жыцень” (1986), “Мы – грамацеі” (1989) і “Золкая зёлка” (1999); кнігі публіцыстыкі “Пасля вогненных вёсак…” (1980), дакументальных аповесцяў “Браніслава” (1985) і “Асвейская трагедыя. 1943” (1992).

З 1967 года – член Саюза пісьменнікаў БССР.

У 1990 годзе арганізаваў Аб’яднанне сяброў чэшскай і славацкай культур імя М. Забэйды-Суміцкага пры Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францыска Скарыны, у 1991 годзе абраны старшынёй рады таварыства “Беларусь–Чэхаславакія”, у 1994 годзе – старшынёй рады таварыства “Беларусь–Латвія”.

У 1991 годзе ганараваны медалём Францыска Скарыны, у [2018] годзе – медалём “Сто гадоў БНР”. У 1993 годзе атрымаў дыплом ЮНЕСКА ў міжнародным літаратурным конкурсе “Сустрэча двух сусветаў” з нагоды 500-

---

[1] Л.М. Гарэлік “Панізнік Сяргей”. // “Беларускія пісьменнікі: Бібліяграфічны слоўнік”. У 6 тамах. Т. 4: Лазарук–Перкін. / Пад рэд. А.І. Мальдзіса. – Мінск: БелСэ, 1994, С. 449.

годдзя адкрыцця Калумбам Амерыкі, у 1996 годзе ўзнагароджаны Ганаровай граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь.

Дакументы С.С. Панізніка паступілі ў БДАМЛМ ад самога фондаўтваральніка ў 1994, 2014 і 2015 гадах. У выніку навуковага апісання быў складзены вопіс № 1, у які ўвайшла 81 справа (1170 дак.) за перыяд [да 1920]–1944, 1961–2015, коп. за 1885, 1920-я, 1940-я, 1989-1991 гады.

Вопіс складаецца з 8 раздзелаў.

У першым раздзеле – “Творчыя дакументы С.С. Панізніка” – змешчаны: яго паэма, верш, артыкулы, нататкі, пераклад, зроблены С.С. Панізнікам з чэшскай мовы на беларускую, і інш. Справы сістэматызаваны па жанрах, унутры жанраў – па храналогіі за 1975–2005, коп. пач. 1940-х гг.

Другі раздзел – “Перапіска С.С. Панізніка” – прадстаўлены трыма падраздзеламі: пісьмы ад С.С. Панізніка, пісьмы да С.С. Панізніка і пісьмы С.С. Панізніку ад устаноў. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па алфавіце краін (пісьмы да і ад дзеячаў беларускай дыяспары ідуць за пісьмамі ад дзеячаў з БССР/Беларусі, гл. Справы №№ 5, 15–20), унутры краін – па алфавіце прозвішчаў адрасатаў/карэспандэнтаў, пісьмы ад адной асобы складзены па храналогіі за 1961–[2015], коп. 1885, 1990–1991 гг.

У трэцім раздзеле – “Дароўныя надпісы С.С. Панізніку” – справы сістэматызаваны па алфавіце прозвішчаў аўтараў дароўных надпісаў за 1968–1997 гг.

Чацвёрты раздзел – “Дакументы да біяграфіі С.С. Панізніка” – змяшчае тры падраздзелы: асабістыя дакументы фондаўтваральніка, дакументы творчай дзейнасці і дакументы даследчай, навуковай і працоўнай дзейнасці С.С. Панізніка. Справы ў іх сістэматызаваны па храналогіі (у некаторых выпадках – па намінальна-храналагічнаму прынцыпу) за 1978–2007 гг.

Пяты раздзел – “Дакументы да юбілейных дат С.С. Панізніка і інш.” – прадстаўлены дакументамі да юбілеяў фондаўтваральніка і дакументамі побытава-гаспадарчага характару. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічнаму прынцыпу за 1985–2007 гг.

У шостым раздзеле – “Дакументы пра і са згадкай С.С. Панізніка” – змешчаны публікацыі, пісьмы і інш., якія прысвечаны ці згадваюць фондаўтваральніка. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па храналогіі за 1978–[п.п. 2007] гг.

Сёмы раздзел – “Дакументы, сабраныя С.С. Панізнікам” – складаецца з падборак дакументаў (асабістых і/ці творчых) вядомых дзеячаў і інш. Справы ў нім сістэматызаваны па тэматычна-храналагічнаму прынцыпу за 1963–2012, коп. за 1920-я, 1989–1990 гг.

У восьмым раздзеле – “Выяўленчыя дакументы С.С. Панізніка, дакументы Я.І. Янішчыц (1-й жонкі)” – змешчаны выяўленчыя дакументы фондаўтваральніка (яго партрэт і экслібрыс, фота, індывідуальныя і ў групе з У.М. Скарынкіным і супрацоўнікамі Гасцёўні Уладзіслава Галубка), гістарычныя фота з яго калекцыі, а таксама дакументы Я.І. Янішчыц. Справы ў раздзеле сістэматызаваны па намінальна-храналагічнаму і тэматычна-

храналагічнаму прынцыпу за перыяд [да 1920] – 1944, [1960-я – да 1994], коп. за 1922–1926/1927 гг.

Прадмову склала
Заг. аддзелам В.Ф. Шаталава
01.06.2026

Установа "Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва"

ФОНД № 32
ВОПІС № 1
[да 1920] - 2015, коп. 1885-1991

ЗАЦВЕРДЖАНА

Пратакол ЭМК БДАМЛМ
ад 09.06.2026
№ 8

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **1. ТВОРЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА** | | | | |
| | Паэма, верш | | | | |
| 1 | С.С. Панізнік. "Напагатове (паэма салдацкіх кастроў)".<br>С.С. Панізнік. "Калі акінуць вокам…". Верш.<br>Аўтограф, машынапіс з аўтарскай праўкай | [1970-я гг.], [1983] | 17 | 2 | |
| | Артыкулы, нататкі і інш. | | | | |
| 2 | С.С. Панізнік "Гаспадар "Беларускай хаткі" ў Рызе" (пра Вячку Целеша), "Знаёмціся: пісьменнік Віктар Вальтар", "Под звездою Райниса", "120 гадоў з дня нараджэння Уладзіміра Пігулеўскага" і інш. Артыкулы, нататкі і інш.<br>Машынапіс з нязначнай аўтарскай праўкай, машынапіс, выразкі і ксеракопія з газет, часопіс "Беларусь" (№ 3, 1993), прысвечаны беларускаму замежжу.<br>На Лл. 3-4, 9 - фота беларусаў Латвіі Міхася Калініна (2) [коп. пач. 1940-х гг.] і Вячкі Целеша (аўтар С.С. Панізнік) (1993), на Лл. 13 (адв.) - 14 - артыкул Г.І. Сурмач "Беларускае слова ў Празе" з фота Г.І. Сурмач аўтарства С.С. Панізніка і згадкай С.С. Панізніка (1993) | 1976-2005, коп. [пач. 1940-х гг.] | 57 | 25/26 | |
| | Пераклады | | | | |
| 3 | Ф. Сокалава. "Беларускія старадрукі ў чэшскіх бібліятэках. Да гісторыі чэшска-беларускіх узаемасувязяў". Артыкул у перакладзе С.С. Панізніка з чэшскай мовы на беларускую (з заўвагамі перакладчыка).<br>Выразка з часопіса | [ад 1984 г.] | 3 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 4 | С.С. Панізнік. "Купалівська струна", "Сябры". Вершы ў перакладзе П.П. Рэбра з беларускай мовы на ўкраінскую.<br>Выразка з газеты | 1990 | 1 | 1/2 | |
| | **2. ПЕРАПІСКА С.С. ПАНІЗНІКА** | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | **2.1. ПІСЬМЫ АД С.С. ПАНІЗНІКА** | | | | |
| 5 | Пісьмы С.С. Панізніка да Н.А. Азаранкі і інш. (Беларусь), Аўгініі Кавалюк (з адначасным зваротам да яе мужа Лявона) (Расія). Чарнавікі | 1996-2007 | 4 | 4 | |
| 6 | Пісьмы С.С. Панізніка да Джыны Тэрманэ (Латвія), М.Д. Львовіч (4) і Р.М. Лубкіўскага (Украіна). Чарнавікі | 1996-2003 | 6 | 6 | |
| | *** | | | | |
| 7 | Паштоўкі С.С. Панізніка да Людмілы Панізнік (2-й жонкі) і дачкі Веранікі | 1985 | 5 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 8 | Пісьмы С.С. Панізніка ў рэдакцыю часопіса "Полымя" па пытанні друку яго верша "Зіма" (1961) і ў рэдакцыю неўстаноўленага часопіса з прапановай да друку яго артыкула "Промні братэрскай еднасці". Пісьмо С.С. Панізніка (на адваротным баку фота з фрагментам надмагільнага помніка Алесю Гаруну) у Беларускі дзяржаўны архіў-музей літаратуры і мастацтва наконт перадачы ва ўстанову дакументаў украінскай паэткі і перакладчыцы М.Д. Львовіч. На Лл. 4-9 - артыкул С.С. Панізніка "Промні братэрскай еднасці" (машынапіс з аўтарскай праўкай) (1965), на Л. 11 - пісьмо М.Д. Львовіч (Украіна) да С.С. Панізніка з просьбай перадаць яе творчыя дакументы на захаванне ў адпаведную гэтаму ўстанову | 1961-1990 | 12 | 5 | |
| | **2.2. ПІСЬМЫ ДА С.С. ПАНІЗНІКА** | | | | |
| 9 | Паштоўкі і пісьмы Э.С. Агняцвет (2), У.А. Арлова (пісьменніка) (2), Д.І. Бічэль-Загнетавай (2), Янкі Брыля, Міхася Верацілы (2), Юркі Голуба, А.Ф. Гуцава, А.М. Дарафеева (2), М.І. Ермаловіча, І.Ф. Жарнасек, М.А. Ільючыка (12), В.Р. Карасёва і інш. (БССР / Беларусь) да С.С. Панізніка. Да пісьмаў М.А. Ільючыка прыкладзены яго нататкі "Гістарычнае пытанне" і інш. (выразкі з газет) (2010-2012) - Лл. 41, 47-48, 55 | 1980-[2015] | 61 | 32 | |
| 10 | Паштоўкі і пісьмы А.М. Карлюкевіча (8), К.С. Карнелюка (3), А. Касцені, А.М. Кірвеля, У.М. Конана, А.В. Куржалава, Я. Лапаткі, М.С. Ляпехі (3), М.М. Маліноўскага (8) і А.І. Мальдзіса (4) (БССР / Беларусь) да | 1978-2012, коп. 1885 | 54 | 32 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | С.С. Панізніка.<br>На Л. 26 - выпіска пра Ф. Багушэвіча з дакументаў "Нежинского окружного суда Конотопской городской управы" (рукапісная копія М.С. Ляпехі за 1885 год) | | | | |
| 11 | Пісьмы Ганны Матусэвіч (Суднік, Сьцепулёнак) (32) (Беларусь) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 1-4 - "Кароценькі агляд гісторыі Літвы" Ганны Матусэвіч (машынапіс, кампутарны выдрук) (1998), на Лл. 5-6 - "Гуляньне на Літве" - успаміны дачкі Ганны Матусэвіч (аўтограф) [1990-я гг.] і інш. | 1998-2012 | 80 | 40 | |
| 12 | Паштоўкі і пісьмы Н.І. Мацяш (17), В.А. Ніжанкоўскай, С.М. Новіка-Пеюна, М.П. Пазнякова, В.К. Палікарпава (2), П.Е. Панчанкі і М.Ф. Плавінскага (5) (БССР / Беларусь) да С.С. Панізніка.<br>На Л. 41 - запіска С.С. Панізніка адносна аўтарства адной з паштовак (аўтограф) | 1977-1998 | 41 | 29 | |
| 13 | Паштоўкі і пісьмы М.М. Пятрэнкі (4), В.П. Рагойшы (2), Р.В. Родчанкі (4), С.В. Рублеўскага, У.Л. Сакалоўскага, А.У. Салтука, Ф.І. Сіўко (4), А.А. Станкевіч, М. Танка, Л.У. Хмяльніцкай і інш. (БССР / Беларусь) да С.С. Панізніка | 1975-2013 | 34 | 22 | |
| 14 | Паштоўкі і пісьмы І.П. Чыгрынава (13), Г. Шпакоўскай, А. Яжэвіча (3), В.Ц. Якавенкі, А.М. Якімовіча (5), Ф.М. Янкоўскага (2), А.А. Яскевіч, М.А. Яцкова (3) і інш. (БССР / Беларусь) да С.С. Панізніка.<br>Да пісьма А.М. Якімовіча прымацаваны нататкі А.М. Якімовіча па гісторыі Слоніма і А. Лабашэвіча (са згадкай А.М. Якімовіча) (выразкі з газет) [1980-я гг.] - Лл. 45-46; да пісьма А. Яжэвіча - яго верш "Maja Vialikaja Litva" з дароўным надпісам С.С. Панізніку ад 15 снежня 2007 года (кампутарны выдрук) (2007) - Лл. 23-24. | 1979-2012 | 57 | 30/32 | |
| | Беларусы замежжа | | | | |
| 15 | Паштоўка і пісьмы Юліі Андрусішын (з адначасным вітаннем ад Данчыка), Францішка Бартуля, Янкі Запрудніка (3), Вітаўта Рамука (7) і Юркі Станкевіча (ЗША).<br>Арыгіналы і ксеракопіі.<br>На Лл. 31-36 - нарыс В. Рамука "Сакавіцкае сьвяткаваньне" (ксеракопія аўтографа) (2005) | 1990-2005, коп. 1990 | 39 | 13 | |
| 16 | Пісьмы Станіслава Валодзькі (16) (Латвія), Аўгініі Кавалюк (3) (адно за адначасным подпісам Лявона | [да 1987] - 2004 | 59 | 29/48 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Кавалюка) (Латвійская ССР / Расія) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 7, 20, 26-51 - нататка С. Валодзькі "Ля Кургана на Івана" (выразка з газеты) (1996), аўтабіяграфія С. Валодзькі (аўтограф) [1990-я гг.], яго вершы "Вільня" і "Памяці Казіміра Сваяка" і падборкі вершаў за 1989-2001 гады (аўтограф і ксеракопія аўтографа, выразкі з газет) і інш. | | | | |
| 17 | Паштоўкі і пісьмы Вячкі Целеша (Латвія) да С.С. Панізніка | 1977 -<br>22 верасня 1980 г. | 70 | 31 | |
| 18 | Паштоўкі і пісьмы Вячкі Целеша (31) (Латвія) да С.С. Панізніка.<br>На Л. 8 - артыкул А. Германіса "Мастак у Тэрветэ" ў перакладзе Вячкі Целеша з латышскай мовы на беларускую (аўтограф перакладчыка) (1977) | 17 лістапада 1980 г.<br>- 1991 | 53 | 32 | |
| 19 | Паштоўкі і пісьмы Янкі Багдановіча, Галіны Войцік і Лявона Луцкевіча, Леакадзіі Мілаш (2) (Літоўская ССР / Літва), І.Ц. Бурсава (4), А.К. Каўкі (2) і М.М. Улашчыка (РСФСР / Расія), Іны Снарскай (Украіна) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 5-8 - нататкі Л. Мілаш "У сэрцы маім Вільня" (аўтограф) (2000) | 1978-2008 | 22 | 13 | |
| 20 | Паштоўкі і пісьмы дзяцей беларускіх дзеячаў: Ірыны Вількель (дачкі С.П. Сахарава) (4) (Латвійская ССР), Г.І. Дылы (дачкі Язэпа Дылы) (РСФСР), Л.І. Краскоўскай (дачкі І.І. Краскоўскага) (Славакія) і А.М. Слівінай (дачкі М.Ф. Галынскага) (2) (Латвія) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 10-13 - біяграфія І.І. Краскоўскага, напісаная Л.І. Краскоўскай (машынапіс) (1995) | 1980-2002 | 17 | 8/9 | |
| | Вялікабрытанія | | | | |
| 21 | Пісьмо Арнольда Макміліна (Вялікабрытанія) да С.С. Панізніка | 1996 | 1 | 1 | |
| | Латвійская ССР / Латвія | | | | |
| 22 | Паштоўкі і пісьмы Мірзды Абалы (29) (Латвійская ССР) да С.С. Панізніка.<br>На Л. 16 - аўтабіяграфія Мірзды Абалы (аўтограф) (1980) | 1977 -<br>20 красавіка 1983 г. | 60 | 30 | |
| 23 | Паштоўкі і пісьмы Мірзды Абалы (Латвійская ССР) да С.С. Панізніка | 28 кастрычніка 1983 г. - 1988 | 43 | 30 | |
| 24 | Паштоўкі і пісьмы Мірзды Абалы (29) (Латвійская | 1989-1991 | 43 | 31 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | ССР / Латвія) да С.С. Панізніка.<br>На Л. 5 - машынапісная копія заявы Інтэрфронту наконт палітычнай абстаноўкі ў Прыбалтыцы (1989), на Лл. 38-40 - рабочыя заўвагі Мірзды Абалы па неўстаноўленаму тэксту (аўтограф) | | | | |
| 25 | Паштоўкі і пісьмы А.П. Антанавічуса, Андрыса Веяна, Петэрыса Зэйле (2), Велты Калтыні, Віктара Ліўзэмніекса (6), Язэпа Османіса (13), Яніса Плотніекса, Талрыда Руліса, Зенты Эргле (2) і інш. (Латвійская ССР) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 39-42 - спіс аўтараў латышскай дзіцячай літаратуры для зборніка "Песня Даўгавы" на беларускай мове (аўтограф Язэпа Османіса) (1985) | 1982-1989 | 52 | 31 | |
| | Літоўская ССР | | | | |
| 26 | Паштоўка і пісьмы Рымантаса Ванагаса (2), Альмы Лапінскенэ, Л.І. Уладзімірава (Владимирова) (2) (Літоўская ССР) да С.С. Панізніка | 1982-1989 | 10 | 5 | |
| | РСФСР, Польшча | | | | |
| 27 | Паштоўка і пісьмы С.П. Красікава, М.У. Раждзественскай (3) (РСФСР / Расія) да С.С. Панізніка.<br>Паштоўка Станіслава [Сяткоўскага] (Польшча) да С.С. Панізніка | 1987-[1997] | 9 | 5 | |
| | УССР / Украіна, Чэхія | | | | |
| 28 | Паштоўка і пісьмы М. Ганчара, І.Ф. Гнацюка (20), Р.І. Лаха, Р.М. Лубкіўскага, У.І. Лучука (7) (адно - сумесна з жонкай А.П. Сенатовіч), П.П. Ребра (5), В. і М. Свянціцкіх, Дзмітра Чарэднічэнкі (Чередниченки) (2) (УССР / Украіна) да С.С. Панізніка.<br>Сяброўская распіска Р.М. Лубкіўскага аб пазыцы на час у С.С. Панізніка кнігі "Брест" (1985), канверт ад пісьма А.П. Сенатовіч-Лучук да С.С. Панізніка (1992).<br>На Л. 27 - вершы І.Ф. Гнацюка "Думка про долю", "Думка про стежку" і інш. (выразка з газеты) (1981) | 1971-2004 | 57 | 41/45 | |
| 29 | Паштоўкі і пісьмы М.Д. Львовіч (24) (УССР / Украіна) да С.С. Панізніка.<br>На Л. 10 - заўвагі М.Д. Львовіч адносна неўстаноўленага перакладу (аўтограф) (1977);<br>на Лл. 45-53, 83-85 - вершы М.Д. Львовіч "Беларускаму сыну Украіны", "Беражна-Крынічнае", "Вам дзякуй за яе…" і інш. (аўтограф, машынапіс) | 1971-1991 | 90 | 36 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | (1970-я гг. - 1991) | | | | |
| 30 | Паштоўкі і пісьмы М.Д. Львовіч (19) (Украіна) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 12-14, 16-17, 22, 37, 40-41, 51, 80-86 - вершы М.Д. Львовіч "Мова наша - ясны зоры…", "Не була колись мовчазною…" і інш. (аўтограф, ксеракопія аўтографа, машынапіс, выразка з часопіса) (1977-2011) | [1992]-2012 | 86 | 33/34 | |
| 31 | Паштоўкі і пісьмы М.Д. Львовіч (23) (Украіна) да С.С. Панізніка.<br>На Лл. 2-12, 40-42, 72-75, 87-88 вершы М.Д. Львовіч "А ці не годзе?..", "Березіль", "Давно я іду до Нього" і інш. (аўтограф, машынапіс) (1994-2013); на Лл. 28-31 - аўтабіяграфія М.Д. Львовіч (аўтограф) (2013).<br>Пісьмо Багдана Зілыньскага (Чэхія) да С.С. Панізніка | 1993, 2013-2014 | 108 | 42/44 | |
| | **2.3. ПІСЬМЫ С.С. ПАНІЗНІКУ АД УСТАНОЎ** | | | | |
| 32 | Паштоўкі і пісьмы ад музея Б.І. Эпімаха-Шыпілы пры Ветрынскай СШ (Полацкі р-н, Віцебская вобласць), літаратурна-краязнаўчага музея Гудзевіцкай СШ (Мастоўскі р-н, Гродзенская вобласць) (4), Музея гісторыі горада Дзісны і этнаграфіі Дзісненскага краю, Мёрскага раённага гісторыка-этнаграфічнага музея і інш. (БССР / Беларусь), Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя М.Я. Салтыкова-Шчадрына (РСФСР) і Славянскай бібліятэкі ў Празе (Чэхія) і інш. да С.С. Панізніка ў справе атрымання яго кніг і матэрыялаў для фондаў і інш.<br>На Л. 19 - копія акта прыёму кнігі С.С. Панізніка "Чало і век" ва Ушачскі музей народнай славы (1981) | 1977-1998 | 32 | 19 | |
| 33 | Пісьмы Літаратурнага музея Петруся Броўкі (2) і праўлення СП БССР да С.С. Панізніка ў справе напісання ім успамінаў пра П.У. Броўку, ад Музея гісторыі літаратуры і мастацтва імя Я. Райніса (4) (Латвійская ССР) у справе ўдакладнення новай інфармацыі пра маці Яна Райніса і інш.<br>На Л. 6 - паштоўка краязнаўцы М.Ф. Плавінскага да С.С. Панізніка з інфармацыяй пра месцазнаходжанне магілы маці Яна Райніса (1981) | 1979-1991 | 19 | 13 | |
| 34 | Паштоўкі і пісьмы ад выдавецтваў "Беларускай Савецкай Энцыклапедыі імя Петруся Броўкі" (4), "Юнацтва" (БССР) і "LIESMA" (Латвійская ССР), газет "Звязда", "Голас Радзімы", "Сцяг працы" (2) (БССР) і "Literatura un Maksla" (Латвійская ССР), | 1975-2004 | 27 | 21 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | часопісаў "Вясёлка" (Беларусь), "Karogs" (Латвійская ССР), "Дружба народов" (1980) (РСФСР) і інш. да С.С. Панізніка па пытанні друку яго твораў і інш. | | | | |
| 35 | Пісьмы ад рэдакцый беларускіх выданняў - часопіса "Полацк" (ксеракопія) (ЗША), часопіса "Прамень" (Латвія), газеты "Рунь" (Літва) і інш. да С.С. Панізніка з навагоднімі віншаваннямі, просьбай дапамагчы з матэрыяламі і інш.<br>Пісьмы ад асацыяцыі "Беларускі шлях" (Рыга), беларускага культурнага таварыства "Уздым" (Даўгаўпілс) (Латвія) і інш. да С.С. Панізніка з просьбай дапамагчы ў пошуку адрасоў мясцовых беларусаў, запрашэннем на мерапрыемствы і інш.<br>На Л. 12 - бланк заяўкі ў "Канцэрт віншаваньняў" Беларускай рэдакцыі Радыё Палёнія | 1989-1999, коп. 1991 | 20 | 15 | |
| | **3. ДАРОЎНЫЯ НАДПІСЫ С.С. ПАНІЗНІКУ** | | | | |
| 36 | Дароўны надпіс Т.С. Касцецкай (Костецькай) С.С. Панізніку ад 8 ліпеня 1968 года на аркушы з вершамі Т.С. Касцецкай на ўкраінскай мове. Аўтограф | | 3 | 1 | |
| 37 | Дароўны надпіс І.І. Лучыца-Федарца С.С. Панізніку ад 8 снежня 1979 года на старонцы з артыкулам І.І. Лучыца-Федарца "Аб статусе паланізмаў у некаторых беларускіх гаворках".<br>Асобны друкарскі адбітак | | 2 | 1 | |
| 38 | Дароўныя надпісы М.Д. Львовіч С.С. Панізніку ад 1970 года і жніўня 1990 года на старонцы газеты з вершамі М.Д. Львовіч з цыкла "Астрашицький городок (Астрашыцкі гарадок)" на беларускай і ўкраінскай мовах і старонцы сшытка з вершамі В. Галека, Д. Максімовіч, С. Панізніка, М. Танка, Ю. Тувіма і інш. у перакладзе М.Д. Львовіч з беларускай, польскай, рускай, сербахарвацкай і чэшскай моў на ўкраінскую (сшытак з аўтографам, выразка з газеты) | | 45 | 2 | |
| 39 | Дароўны надпіс Рудольфа Рымеля (Rudolf Rimmel) С.С. Панізніку ад 6 жніўня 1968 года на шмутцытулі зборніка вершаў Р. Рымеля "Sona romantikast" | | 1 | 1 | |
| 40 | Дароўныя надпісы Вячкі Целеша С.С. Панізніку ад 17 снежня 1978 года да 9 лістапада 1984 года на старонках сваіх артыкулаў.<br>Выразкі з газет і часопіса | | 9 | 5 | |
| 41 | Дароўны надпіс С.С. Шаўрова С.С. Панізніку ад | | 5 | 1 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | 17 траўня 1997 года на вокладцы брашуры "Сямён Шаўроў" | | | | |

## 4. ДАКУМЕНТЫ ДА БІЯГРАФІІ С.С. ПАНІЗНІКА

### 4.1. АСАБІСТЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 42 | Пасведчанні праходжання курсаў павышэння кваліфікацыі Дзяржтэлерадыё БССР (па плану рэдактараў тэлебачання) і Усесаюзнага інстытута павышэння кваліфікацыі работнікаў друку (па рэдакціраванню) на імя С.С. Панізніка.<br>Разавы пропуск на права ўваходу ў будынак Белтэлерадыёкампаніі, часовы пропуск для ўваходу ў інтэрнат Маскоўскага выдавецка-паліграфічнага тэхнікума імя Івана Фёдарава і інш. на імя С.С. Панізніка | 1980-1996 | 7 | 5 | |
| 43 | Запрашэнні Беларускага таварыства дружбы народаў і культурнай сувязі з замежнымі краінамі, Мінскага міжнароднага адукацыйнага цэнтра імя Йяханеса Рау, СП БССР / Беларусі і інш. на літаратурныя вечары і вечары памяці Фёдара Абрамава, Яна Баршчэўскага, Анатоля Вялюгіна, Міхася Забэйды-Суміцкага, Анатоля Кірвеля і інш., тэатральныя пастаноўкі і інш. на імя С.С. Панізніка.<br>На канверце аднаго з іх - аўтографы ўдзельнікаў свята паэзіі Д.І. Бічэль-Загнетавай, С.І. Законнікава і інш. (1986), на другім - аўтографы некаторых супрацоўнікаў выдавецтва "Мастацкая літаратура" (1992) | 1982-2007 | 60 | 37 | |
| 44 | Запрашэнні і інш. на арганізацыйныя сходы па стварэнню Беларускага камітэта памяці ахвяр сталінізму, Грамадскага таварыства беларускай культуры пры Літоўскім фондзе культуры, сумеснага культурнага таварыства "Холмщина" і інш. на імя С.С. Панізніка | 1988-2006 | 17 | 12 | |
| 45 | Запрашэнні СП Латвійскай ССР, Запарожскай арганізацыі СП Украіны і Львоўскага аддзялення Украінскага фонду культуры і інш. на Дні паэзіі Яна Райніса, "Поэтический май" у Запарожжы, 22-ю сустрэчу беларусаў ЗША і інш. на імя С.С. Панізніка.<br>Запрашэнні ад Пасольстваў Кітайскай народнай рэспублікі, Латвійскай рэспублікі, Літоўскай рэспублікі, Чэшскай рэспублікі і інш. у Мінску на розныя мерапрыемствы на імя С.С. Панізніка | 1988-2007 | 20 | 13 | |

### 4.2. ДАКУМЕНТЫ ТВОРЧАЙ ДЗЕЙНАСЦІ С.С. ПАНІЗНІКА

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 46 | Афішы "XXVI свята літератури на Запоріжжі" і | 1980, 1990 | 2 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | свята кнігі "Горизонты великого созидания" (Ялта) (УССР) (з удзелам С.С. Панізніка) | | | | |
| 47 | Самаробныя афішы літаратурных сустрэч С.С. Панізніка з чытачамі ў літаратурнай гасцёўні "Ўзлёт" і неўстаноўленай бібліятэцы (апошняя - сумесна з К.А. Лялько).<br>Самаробныя афішы "Вечера поэзии народов СССР" і інш. з удзелам С.С. Панізніка (папера, гуаш, туш). На 3-х з іх - аўтографы Элісбара Ананіашвілі, Алеся Бадака, Сяргея Кавалёва, Сямёна Руфава, Кнутса Скуеніекса і інш. | 1987-1990 | 4 | 4 | |
| 48 | Запрашэнні Беларускага таварыства дружбы і культурнай сувязі з замежнымі краінамі і СП БССР на творчыя вечары С.С. Панізніка.<br>Праграма раённага свята беларускай паэзіі "Пра ўсё сказаць прыйшла пара" з удзелам С.С. Панізніка | 1989-1997 | 9 | 4 | |
| | *** | | | | |
| 49 | Дакументы аб сяброўстве С.С. Панізніка ў СП БССР/Беларусі (мандат дэлегата IX з'езда пісьменнікаў БССР з правам рашаючага голасу на імя С.С. Панізніка, выпіска з пратакола пасяджэння сакратарыята СП БССР па пытанні ўключэння С.С. Панізніка ў рэдкалегію кнігі "Беларусь-Літва" і інш.) | 1985-2007 | 4 | 4 | |
| 50 | Выдавецкія дамовы паміж выдавецтвам "Мастацкая літаратура" і С.С. Панізнікам на выданне яго твора "Свой пачэсны пасад", выдавецтвам "Юнацтва" і калектывам аўтараў на выданне твору "Жыві ў свабодзе! Кніга пра К. Каліноўскага" (С.С. Панізнік - укладальнік).<br>Пісьмо Камітэта па аўтарскіх і сумежных правах пры Міністэрстве юстыцыі Рэспублікі Беларусь да С.С. Панізніка аб заключэнні з ім дамовы аб кіраванні яго маёмаснымі правамі па выкарыстанню яго твораў | 1995-2007 | 5 | 3 | |

## 4.3. ДАКУМЕНТЫ ДАСЛЕДЧАЙ, НАВУКОВАЙ І ПРАЦОЎНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ С.С. ПАНІЗНІКА І ІНШ.

Дакументы аб даследчай і навуковай дзейнасці С.С. Панізніка

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| 51 | Дакументы аб вывучэнні С.С. Панізнікам лёсаў дзяцей - вязняў канцэнтрацыйных лагероў і інш. (пісьмы ад вучняў 8-гадовых школ вёскі Росіцы (БССР) і станцыі Мядвёдаўская (РСФСР) да | 1978-1988 | 10 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | С.С. Панізніка з просьбай прысланць сабраныя ім матэрыялы па падзеях 1941-1945 гадоў і інш.; запрашэнне дырэкцыі школьных музеяў "Дети и война" і "Память" (РСФСР) на V злёт былых дзяцей-вязняў; пісьмы ад часопіса "Радянська жінка" і галоўнай рэдакцыі праграм для дзяцей Украінскага тэлебачання да С.С. Панізніка з падзякай за дасланы матэрыял і просьбай параіць былых дзяцей-вязняў для запісу праграмы (1988) | | | | |
| | *** | | | | |
| 52 | Дакументы аб удзеле С.С. Панізніка ў міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях (запрашэнні на канферэнцыі "Двина-Даугава", "Культура беларуска-расійска-балцкага сумежжа", "Янка Купала - публіцыст" і інш. на імя С.С. Панізніка; праграма канферэнцыі "Двина-Даугава", пасведчанне ўдзельніка VII рэспубліканскай канферэнцыі Беларускага таварыства дружбы народаў і культурнай сувязі з замежнымі краінамі на імя С.С. Панізніка і інш.) | 1988-2001 | 13 | 7 | |
| | Дакументы аб працоўнай дзейнасці С.С. Панізніка | | | | |
| 53 | Дакументы аб працы С.С. Панізніка рэдактарам выдавецтва "Юнацтва" (рэдактарскія заключэнні С.С. Панізніка на рукапісы аповесці У.І. Аляхновіча "Рабінзоны Чамяроўскай пушчы", кнігі апавяданняў Я.М. Гаварушкі "Вітанаўцы" і інш., пісьмо загадчыка рэдакцыяй літаратуры па камуністычнаму выхаванню Н. Маеўскай да С.С. Панізніка па пытанні ўключэння ў выдавецкі план аповесці "Асвея" і інш.) і інш. | 1982-1997 | 20 | 10 | |
| 54 | Карэспандэнцыя рэдактара выдавецтва "Юнацтва" і інш. С.С. Панізніка (да В.С. Кудлачова, ад С.А. Алексіевіч, В.В. Бутрыма (2), З.І. Дудзюк, М.М. Дуксы, М. Казакова, А.К. Касько, Л.П. Мірачыцкага, П.Е. Панчанкі, Г.М. Праневіча і інш. з БССР / Беларусі, Латвійскай ССР, УССР, ЭССР) па пытанні ўключэння іх твораў у рыхтуемыя выдавецтвам і інш. праекты.<br>На Лл. 19-21 - сцэнка Л.П. Мірачыцкага "Купала ў Чэхіі" (ксеракопія аўтографа); на Лл. 25-27 - маналог Л. Рабцэвіч-Бранавіцкай "На мяжы стагоддзяў і тысячагоддзяў (2000-годдзе хрысціянства). Уладыку Філарэту, Мітрапаліту Мінскаму і Слуцкаму, Патрыяршаму Экзарху Усяе Беларусі" (машынапіс) (2000); на Лл. 39-40 - вершы І.С. Валюкевіча | 1980-2001 | 56 | 36 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | (аўтограф) (1980) | | | | |
| | *** | | | | |
| 55 | Дакументы аб працы С.С. Панізніка вядучым тэлевізійных перадач "Мой родны кут", "Тры сустрэчы" да 100-годдзя з дня нараджэння Я. Купалы і інш. (пісьмо І.І. Лучыца-Федарца (БССР) са зваротам "Паважаныя таварышы!" (1980) з ацэнкай працы вядучага - С.С. Панізніка ў перадачы "Мой родны кут"; заяўка на ўключэнне праграмы "Тры сустрэчы" ў перадачы мясцовага тэлебачання і бланк атэстацыі гэтай праграмы і інш.) | 1980-1988 | 8 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 56 | Дакументы аб працы С.С. Панізніка ў Нацыянальным навукова-асветным цэнтры імя Францыска Скарыны (хадайніцтва і рэкамендацыя А.І. Мальдзіса (старшыні) у Беларускі фонд Сораса, Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь і інш. аб камандзіраванні С.С. Панізніка (супрацоўніка) у Славянскую бібліятэку Прагі і інш.) і вучоным сакратаром Дзяржаўнага літаратурнага музея Янкі Купалы (заявы С.С. Панізніка на імя дырэктара музея з просьбай дазволіць наведванне пасяджэння Каардынацыйнай рады "Дзвіна-Даўгава" ў Віцебску і камандзіроўку на Дні славянскага пісьменства ў Латвіі і інш.) | 1995-1998 | 12 | 11 | |

**5. ДАКУМЕНТЫ ДА ЮБІЛЕЙНЫХ ДАТ С.С. ПАНІЗНІКА І ІНШ.**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 57 | Віншавальныя паштоўкі С.П. Красікава (РСФСР) і В.А. Санько (БССР) С.С. Панізніку з 50-годдзем з дня нараджэння.<br>Буклет "Юбіляры. Сяргей Панізнік" і артыкулы да 50- і 65-годдзя С.С. Панізніка (выразкі з газет) | 1992-2007 | 10 | 5 | |
| | *** | | | | |
| 58 | Пісьмо Усесаюзнага агенцтва па аўтарскіх правах да С.С. Панізніка ў справе выплаты яму ганарара за зборнік "Баллада о дружбе", выдадзенага ў Польскай народнай рэспубліцы, даведка Саюза беларускіх пісьменнікаў аб творчым стажу С.С. Панізніка.<br>Анкета госця Полацкага гатэля "Двина" на імя С.С. Панізніка, уваходныя квіткі розных аб'ектаў у Маскве (РСФСР), набытыя С.С. Панізнікам, і інш. | 1985-2001 | 11 | 10 | |

**6. ДАКУМЕНТЫ ПРА І СА ЗГАДКАЙ С.С. ПАНІЗНІКА**

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 59 | Артыкулы і інш. пра і са згадкай С.С. Панізніка і яго твораў (аўтограф, выразкі і ксеракопіі з газет і часопісаў).<br>Паштоўка і пісьмы П.П. Рэбра (УССР) да І.Р. Новікава, М. Рэпкава-Смаршчка (ЗША) са зваротам "Вельмішаноўная Спадарыня Сёмуха!", В. Целеша (Латвійская ССР) да Э. Варашылава і інш. са згадкай С.С. Панізніка | 1978 - [п.п. 2007 года] | 42 | 32/33 | |
| 60 | Бібліяграфічны спіс "Сувязі беларускай і латышскай літаратур (па беларускіх публікацыях)" за 1957-1985 гады (складальнік - Мірзда Абала) (машынапіс з дапіскамі складальніка) са згадкай С.С. Панізніка.<br>Самаробная карта "Общие судьбы литовской и белорусской литератур" з пазначанымі месцамі нараджэння беларускіх і літоўскіх літаратараў (у т.л. С.С. Панізніка) (аўтар - Валтас Банайціс) (ксеракопія з дапіскамі аўтара і фотакопія) | [ад 1985] - [1990-я гг.] | 97 | 2 | |
| | **7. ДАКУМЕНТЫ, САБРАНЫЯ С.С. ПАНІЗНІКАМ** | | | | |
| | М. Абала | | | | |
| 61 | M. Abola (Мірзда Абала). "Sudrabkalns Baltkrievu dzejnieces atminas" ("Успаміны беларускай паэткі [Э.С. Агняцвет] аб Янісу Судрабкалнсу). Агляд (выразка з часопіса).<br>E. Agnicveta (Э.С. Агняцвет). "Musu draugs Zanis Griva" ("Наш сябра Жан Грыва"). Публікацыя ў перакладзе Мірзды Абалы з беларускай мовы на латышскую (выразка з часопіса).<br>Віншавальная паштоўка Э.С. Агняцвет да Мірзды Абалы і нататка В. Вяржэніча, А. Мальдзіса і А. Мажэйкі "Жыве ў Рызе наш друг" пра Мірзду Абалу (выразка з газеты) | 1977-1985 | 9 | 4 | |
| | В. Вальтар | | | | |
| 62 | В. Вальтар "Роджаныя пад Сатурнам". Раман пра беларусаў Прагі ў 1920-я гады. Пачатак. Фотакопія аўтографа | коп. 1920-х гг. | 175 | 1 | |
| 63 | В. Вальтар "Роджаныя пад Сатурнам". Раман пра беларусаў Прагі ў 1920-я гады. Заканчэнне. Фотакопія аўтографа.<br>На Л. 118 - [дакладная запіска] галоўнага рэдактара выдавецтва "Юнацтва" М.П. Пазнякова ў сувязі з прыпыненнем выдання рамана В. Вальтэра "Роджаныя пад Сатурнам" з-за недахопу сродкаў (1998) | коп. 1920-х гг. | 118 | - | |
| | У.С. Караткевіч | | | | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| 64 | Брашура "Владимир Короткевич. Уладзімір Караткевіч", кароткі змест рамана У.С. Караткевіча "Чёрны замок Ольшанский" (аўтограф неўстаноўленай асобы) і інш.<br>Вершы Э.А. Акуліна "Памяці Уладзіміра Караткевіча", А.І. Канапелькі "Хрыстос прызямліўся ў Гародні", А.А. Лойкі "Маленне да Ўладзіміра Караткевіча" і інш. (машынапіс, кампутарны выдрук, выразка з газеты).<br>Запрашальныя білеты, календары і праграма святочных мерапрыемстваў, прысвечаных У.С. Караткевічу; фота частак экспазіцыі музея СШ № 3 імя У.С. Караткевіча ў Оршы (2) і інш. | [ад 1978] - 2005 | 36 | 18/33 | |
| | М.Д. Львовіч | | | | |
| 65 | М.Д. Львовіч. Вершы з цыклаў "Белае возера", "Страцім-лебедзь" і інш.<br>Аўтограф, машынапіс, выразка з газет | 1970-я гг. - 2012 | 57 | 53 | |
| 66 | Вершы М. Багдановіча "Ти не згаснеш, ранняя зоряночко…", "Погоня" і інш., Я. Купалы "Вічним бором", "І вітер, і сокіл, і я…" і інш., А.В. Пысіна "Вогонь чи кров стікае…", "Знов я бачив…", "І все могла…" і інш. у перакладзе М.Д. Львовіч з беларускай мовы на ўкраінскую (аўтограф перакладчыка, сшытак з аўтографам перакладчыка, машынапіс, выразка з газеты).<br>Бібліяграфія па тэме "Максім Багдановіч", укладзеная М.Д. Львовіч (аўтограф).<br>Запіска М.Д. Львовіч А.І. Мальдзісу (аўтограф), агляд на зборнік вершаў М.Д. Львовіч "Мелодія щастя. Мелодыя шчасця" (выразка з газеты) | [ад 1968] - 2015 | 55 | 9/51 | |
| | П.А. Масальскі (Пятро Сакол) | | | | |
| 67 | Латышскія народныя казкі "Дарагі куль жыта", "Леснікова люлька", "Тры вузялкі" і інш. і латышскія народныя песні "Добра, добра лесніčанкам…", "Цяжка жонка ўздыхала…" і інш. у перакладзе П.А. Масальскага (Пятра Сакола) з латышскай мовы на беларускую (чарнавы аўтограф перакладчыка).<br>Запрашэнне Інстытута мовы і літаратуры імя А. Упіта АН Латвійскай ССР на вечар Крыш'яна Барана на імя П.А. Масальскага (на латышскай мове).<br>На Лл. 93-100 - сшытак з запісанай латышскай казкай "Ka bralis puki parvar un masas izglabj" ("Як брат перамагае дракона і ратуе сваіх сясцёр") | 1983 - [да лета 1985] | 103 | 5 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справаў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | (аўтограф П.А. Масальскага) | | | | |
| | Вячка Целеш | | | | |
| 68 | Афішы мастацкіх выстаў аб'яднання беларусаў Балтыі "Маю гонар" (В. Целеш - старшыня і ўдзельнік) (на беларускай і латышскай мовах). Паштоўка В. Целеша да Г.І. Сурмач (дырэктара Беларускага дзяржаўнага архіва-музея літаратуры і мастацтва) з запрашэннем наведаць выставу аб'яднання беларусаў Балтыі "Маю гонар" | 1991-2001 | 5 | 4 | |
| 69 | Дакументы мастацкай дзейнасці В. Целеша (рэпрадукцыі яго цынкатыпій з цыклу "У цені часу трыумфаў" (2), афішы (2), буклет яго мастацкай выставы і інш. (на англійскай, беларускай, латышскай і рускай мовах) | 1992-2003<br>коп. 1989-1990 | 9 | 5/6 | |
| 70 | Артыкулы В. Целеша "В альбомах - старый Гродно", "Рассказывают старые рижские открытки", "Редкие снимки Волковыска" і інш. (на беларускай, латышскай і рускай мовах).<br>Артыкулы і нататкі, каталог мастацкага фільма "Каменистый путь" (Рыжская кінастудыя) і інш. са згадкай В. Целеша (на беларускай, латышскай і рускай мовах).<br>Аўтограф, машынапіс, ксеракопія машынапісу, друкаванае выданне, выразкі з газет і часопісаў | 1977-1986 | 53 | 19 | |
| | *** | | | | |
| 71 | Пісьмы Ганны Матусэвіч (Суднік, Сьцепулёнак) (Беларусь) да Яна Пятроўскага і ў рэдакцыю газеты "Наша ніва", Сяргея Юркова (БССР) да Вольгі Іпатавай і інш.; пісьмо Язэпа Османіса (Латвійская ССР) са зваротам да "Валентина Антоновича".<br>Запіскі Таццяны Бей, Анатоля Вераб'я, Міхася Скоблы і інш. (на беларускай і ўкраінскай мовах) да Эдуарда Акуліна (аўтографы) і інш. | 1972-2000 | 15 | 9/14 | |
| | *** | | | | |
| 72 | Вершы і вянкі санетаў Міхаіла Бадрова, Петруся Броўкі, Алены Бяляевай, Івана Гнацюка, Освальдса Краваліса, Віктара Лапкоўскага, Кастуся Шавеля і інш. (на беларускай, літоўскай, рускай і ўкраінскай мовах).<br>Прадмова Юлія Ванага да кнігі Эдуарда Саленіека, тэкст выступлення Н.С. Гілевіча на VII з'ездзе пісьменнікаў СССР, буклет "Максім Танк" і інш.<br>Аўтографы, аўтарызаваны машынапіс з аўтарскай | 1977-1996 | 118 | 21/300 | |

| №№ п/п | Загалоўкі спраў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | праўкай, аўтарызаваны машынапіс, ксеракопія аўтарызаванага машынапісу, машынапіс, друкаваныя выданні, выразка з газеты.<br>На Л. 27 - каталог выставы "ЗБАНАБЗ" (аўтар канцэпцыі Алесь Разанаў) (1993) | | | | |
| | Тэматычныя падборкі і інш. | | | | |
| 73 | Падборка матэрыялаў па гісторыі Цэнтральнай і Усходняй Еўропы ад эпохі Адраджэння да пачатку XXI стагоддзя (газета "Голас Радзімы", прысвечаная Міколе Гусоўскаму; часопіс "Камунікат", прысвечаны 170-годдзю паўстання 1830/1831 гадоў; спіс асоб, расстраляных у Цярнопальскай турме ў 1941 годзе; плакат з фотапартрэтамі кіраўніцтва Чэхаславакіі на чале з Густавам Гусакам і інш.) (на англійскай, беларускай, рускай і ўкраінскай мовах).<br>Кампутарны выдрук, перыядычныя выданні і газетныя выразкі | 1974-2006 | 83 | 35 | |
| 74 | Падборка матэрыялаў па гісторыі беларусаў Латвіі (бібліяграфічны спіс "Baltkrievu gramatas Raina biblioteka" ("Беларускія публікацыі ў бібліятэцы горада Райна") за 1909-1971 гады і інш., статут Латвійскага таварыства беларускай культуры "Світанак", афіша выставы "Беларусы ў Латвіі" з фондаў Рыжскіх бібліятэк і прыватных архіваў і інш.).<br>Ксеракопія аўтографа, машынапіс з дапіскамі, самаробнае друкаванае выданне, ксеракопія з газеты | [1970-я гг.] - 1991 | 61 | 8 | |
| | *** | | | | |
| 75 | Рэпертуарная афіша Львоўскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Івана Франка (1963), гастрольная афіша Беларускага дзяржаўнага драматычнага тэатра імя Якуба Коласа (1965), буклеты Львоўскага дзяржаўнага акадэмічнага ўкраінскага драматычнага тэатра імя Марыі Занькавецкай з рэпертуарам на 1988 год і спектакля "Барбара Радзівіл" паводле паэмы Р. Баравіковай Дзяржаўнага тэатра-лабараторыі нацыянальнай драматургіі "Вольная сцэна" (1994) і інш. (на беларускай, рускай і ўкраінскай мовах) | 1963-1994 | 32 | 8 | |
| | **8. ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ ДАКУМЕНТЫ С.С. ПАНІЗНІКА, ДАКУМЕНТЫ Я.І. ЯНІШЧЫЦ (1-Й ЖОНКІ)** | | | | |
| 76 | В. Целеш. "Партрэт паэта Сяргея Панізніка". | 1978, 1993 | 17 | 2 | |

| №№ п/п | Загалоўкі справў | Крайнія даты | Коль-касць лістоў | Коль-касць дак-ў | АКД |
|---|---|---|---|---|---|
| | Рэпрадукцыя ў каталозе мастацкіх прац В. Целеша (на Л. 1 (адв.) - дароўны надпіс В. Целеша Беларускаму дзяржаўнаму архіву-музею літаратуры і мастацтва ад 13 студзеня 1993 года).<br>В. Целеш. "Пасвячэнне С. Панізніку". Экслібрыс | | | | |
| | *** | | | | |
| 77 | Фотаздымкі С.С. Панізніка, індывідуальныя | [1960-я гг. - да 1994] | 6 | 6 | |
| 78 | Фотаздымак С.С. Панізніка ў групе з У.М. Скарынкіным і супрацоўнікамі Гасцёўні Уладзіслава Галубка | 1982 | 1 | 1 | |
| | *** | | | | |
| 79 | Фотаздымкі беларускіх вучняў на экскурсіі на Рыжскім узмор'і і слухачоў курсаў павышэння кваліфікацыі для беларускіх настаўнікаў (2) (на 2-х ёсць К. Езавітаў) (Даўгаўпілс), вучняў і настаўнікаў Першай беларускай рыжскай асноўнай школы, трупы Беларускага народнага тэатра ў Рызе (сярод іх - Я. Камаржынскі, С. Кудраўцаў, К. Мяжэцкі, М. Слосман і інш.).<br>Фотаздымкі гарадскога духавога аркестра і чыгуначнікаў горада Дзвінска (цяпер - Даўгаўпілс) | [да 1920] - 1944 | 9 | 7 | |
| 80 | Фотаздымкі сцэн са спектакляў Беларускага дзяржаўнага тэатра "Жрэц Тарквіній" (1924), "Мяшчанін у дваранах" (1924), "Савецкі чорт" (1924), "Каваль-ваявода" (1925), "Чырвоная маска" (1925) і спектакля Беларускага дзяржаўнага тэатра-2 "Апраметная" ("Зруйнаваная цемра") (1926/1927). Копіі | коп. 1922-1926/1927 | 10 | 10 | |
| | Дакументы Я.І. Янішчыц (1-й жонкі) | | | | |
| 81 | Дакументы Я.І. Янішчыц (1-й жонкі): паштоўкі і пісьмо Весяліны Нікалаевай (Ніколавай) (Балгарыя), М.Д. Львовіч (УССР) і інш. да Я.І. Янішчыц; фотаздымак Я.І. Янішчыц, індывідуальны (розныя памеры).<br>На Л. 2 - верш Младзена Ісаева "Високи сини планини…" (аўтограф В. Нікалаевай) (1973) | 1971-1975 | 12 | 9 | |

У дадзены вопіс унесена 81 (восемдзесят адна)
справа з № 1 па № 81 , 1164 дакументаў.
Вопіс склала і апрацоўку
фонду зрабіла

заг. аддзелам ____________________ В.Ф. Шаталава
2026

Дакументы прынялі:

вяд. архівіст аддзела ____________________ В.І. Бярэйшык

забеспячэння захаванасці дакументаў

"_____"____________20____ г.